# ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

1 ВЕРАСНЯ 2016 г.
ЧАЦВЕР
№ 16 (15800)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года


*Імёны*

## The Silicon: Танцы, сонца, рок-н-рол з беларускім акцэнтам

**У Беларусі існуе гурт, які выконвае ўласныя кампазіцыі ў рэдкім стылі сёрф-рока. Гэтая музыка першапачаткова стваралася для курортнікаў і сёрфераў на каліфарнійскіх пляжах, але паступова развілася ў асобны стыль. Мелодыі з бясклапотнымі і паўдзённымі адценнямі вось ужо дзесяць гадоў іграе гурт The Silicon. Каманда доўгі час была фактычна адзінай прадстаўніцай сёрфу ў нашай краіне. The Silicon — гэта ўдарнік Ігар Сухарукаў, бас-гітарыст Канстанцін Калеснікаў і гітарыст Дзмітрый Паплаўскі. З Дзмітрыем мы і гутарым пра адметнасці стылю, чысціню жанру, рэакцыю беларускай публікі на такую рэдкую музыку і канкурэнцыю з калегамі.**




***— Дзіма, сёрф у нашай краіне — сапраўдная экзотыка. Як бы ты яго коратка апісаў?***

— У ім часта адсутнічае вакал, гітара гучыць з асаблівым эфектам, які нагадвае шум прыбоя. Мелодыя пастаянна паўтараецца ў пэўнай варыяцыі — нібыта хваля адкацілася і зноў накацілася на бераг. Ёсць дакладны рытм, ад якога, як той казаў, ногі самі танчаць. Сёрф-рок зарадзіўся і развіўся ў Каліфорніі ў канцы 1950-60-х гадоў, а каралём стылю лічыцца гітарыст Дзік Дэйл, які, дарэчы, мае беларускія карані. Новую хвалю папулярнасці стыль перажыў у 1990-я, у многім дзякуючы легендарнаму фільму Квенціна Таранціна «Крымінальнае чтыво». Сюжэт стужкі да сёрфа не мае ніякага дачынення, аднак па ўдалай задумцы рэжысёра ў ёй гучыць некалькі залатых хітоў жанру.

***— Ці часта даводзіцца слухачам тлумачыць гэтыя адметнасці?***

— Так, таму нас і ведаюць як выканаўцаў музыкі ў стылі фільмаў Квенціна Таранціна. Раней мы былі адзіным у Беларусі сёрф-рок-гуртом. Але ўжо з'явілася некалькі камандаў, якія таксама іграюць нешта падобнае. Наш бас-гітарыст Косця Калеснікаў стварыў уласны праект. Цікава, што ў Мінску сёрф-рок пачалі іграць яшчэ ў савецкія часы. Тут існаваў гурт «Алгарытмы», а ў 1968 годзе праходзіў фестываль біт-ансамбляў, падчас якога гучаў і сёрф.

***(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)***

*Усё атрымаецца!*

## Як стаць сапраўдным студэнтам?

### Парады першакурснікам



Фота Надзеі БУЖАН.

**Я студэнтка. Новы калектыў, выкладчыкі, само жыццё... І яно не падобна на тое, да якога я прывыкла за адзінаццаць гадоў вучобы ў школе... Закончыўся ўжо год навучання. Цяпер нас па праве можна назваць сапраўднымі студэнтамі! Гэта мы на першай лінейцы не ведалі, як выглядаюць будучыя аднагрупнікі і як завуць куратара, гэта мы блукалі па калідорах у пошуках патрэбнай аўдыторыі, гэта мы не ўяўлялі, што такое сесія, але ўжо загадзя яе баяліся. І вось першы год нашага студэнцтва падышоў да канца. Даўся ён нялёгка — прыйшлося прывыкнуць да новага рытму, асвоіцца, бо замест урокаў — пары, замест настаўнікаў — выкладчыкі, ды і сістэма ацэньвання адрозніваецца ад школьнай. Шмат што змянілася за гэты год. Колькі новых і цікавых рэчаў я спазнала, з колькімі незвычайнымі людзьмі пазнаёмілася, колькі месцаў наведала і чаму толькі не навучылася!**

### ГАЛОЎНАЕ — МЕЦЬ ЖАДАННЕ

— Вялікі горад — больш магчымасцяў, — расказвае студэнтка другога курса факультэта міжнародных адносін БДУ (спецыяльнасць «Лінгвакраіназнаўства») Настасся Пуцiліна. — Я стараюся не ўпускаць нічога: хаджу на розныя выставы, трэнінгі, майстар-класы, у тэатры. Вядома, не забываю і пра вучобу. Год таму я выбрала гэтую спецыяльнасць, таму што зацікавілася кітайскай мовай і культурай, і ніколькі не шкадую аб сваім рашэнні. Вучыцца няпроста, але пры жаданні ўсё магчыма — і адпачыць, і добра здаць сесію.

Студэнцкае жыццё моцна адрозніваецца ад таго, да чаго я прывыкла: больш свабоды, але і больш адказнасці. Мне вельмі пашанцавала з асяроддзем, таму адаптацыя да новых умоў прайшла хутка. Са мной у групе вучыцца 29 чалавек (з іх толькі адзін хлопец). Памятаю, як 1 верасня ўсе стаялі на лінейцы і разглядалі адно аднаго: усе такія розныя, ніхто нікога не ведае. А цяпер мы ўжо адзін дружны калектыў і гэта выдатна. Спадзяюся, што праз пяць гадоў кожнага з аднагрупнікаў змагу назваць калегам і сябрам.

### АДКАЗНАСЦЬ І ПРАЦА ШТОДНЯ

Студэнтка другога курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Паліна Хадорык адзначае, што першакурснікі хоць і адрозніваюцца ад школьнікаў, але і на бывалых студэнтаў яшчэ не падобныя.

***(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)***

*З «базай» у галаве*

## ЖЫЦЦЮ НАВУЧЫЦЬ... ІНФАРМАТЫКА

### Дыскусіі пра карысць гэтага школьнага прадмета не сціхаюць

**З 1 верасня 1985 года «Інфарматыка», а дакладней прадмет «Асновы інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі», стаў абавязковым ва ўсіх школах Савецкага Саюза. Вось толькі трыццаць гадоў таму пра існаванне камп'ютарнай тэхнікі нашы школьнікі ведалі выключна тэарэтычна, пра персанальныя камп'ютары ніхто яшчэ не марыў, на 3D-мадэляванне і стварэнне ўласных мультфільмаў на ўроках не замахваўся, таму змест гэтага прадмета, як і сэнс праграмавання, так і застаўся для многіх таямніцай за сямю пячаткамі. Сучасныя дзеці з камп'ютарамі і шматлікімі гаджэтамі на «ты» і ў многіх пытаннях апяраджваюць сваіх бацькоў. Чаму іх трэба вучыць на школьных уроках інфарматыкі і ў якім увогуле ўзросце трэба распачынаць яе выкладанне? Каб знайсці адказы на свае пытанні, мы накіраваліся ў Нацыянальны інстытут адукацыі. Нашымі суразмоўцамі сталі начальнік навукова-даследчага цэнтра НІА, доктар педагагічных навук, дацэнт Васіль РУСЕЦКІ, кандыдат педагагічных навук, дацэнт, загадчык лабараторыі матэматычнай і прыродазнаўчанавуковай адукацыі Наталля КАСЦЮКОВІЧ і галоўны навуковы супрацоўнік гэтай лабараторыі, доктар педагагічных навук, прафесар БДУ Віктар КАЗАЧОНАК.**

***(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)***



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.